ЧЫРВОНАЕ І ЧОРНАЕ

«НАЦЫЯНАЛІЗМ» І ТРАГЕДЫЯ АЛЯКСАНДРА ЧАРВЯКОВА

Перш чым расказаць аб трагедыі гэтага чалавека, варта ўспомніць час, у які ён жыў, прыгадаць атмасферу штучнага абвастрэння класавай барацьбы. Выступленне Сталіна на красавіцкім (1929 г.) пленуме ВКП(б) аб правым ухіле ў партыі і абвешчаны ім «рашаючы паварот ва ўсёй нашай палітыцы» стварылі пагрозу для насельніцтва Беларусі і асабліва нацыянальнай інтэлігенцыі. Насцярожвала рэзкая крытыка, з адпаведнымі арганізацыйнымі захадамі, «тэатральнай дыскусіі», у цэнтры якой былі праблемы і шляхі развіцця беларускага нацыянальнага тэатра. У друку разгортвалася вострая палеміка вакол шэрага артыкулаў часопіса «Полымя». У іх, як лічыла афіцыйнае партыйнае кіраўніцтва, недаацэньвалася роля бальшавіцкіх арганізацый і перабольшвалася значэнне «Нашай нівы», Беларускай сацыялістычнай грамады ў гісторыі вызваленчага руху і падрыхтоўцы кастрычніцкага перавароту.

Усё тое, што не адпавядала, а тым больш супярэчыла ўстаноўкам монаідэалогіі, часцей і настойлівей тлумачылася як праява нацыянал-дэмакратызму, мэта якога — рэстаўрацыя ў Беларусі парадкаў, арыентаваных на буржуазны Захад. Такая сітуацыя не магла не закрануць шматгадовага старшыню ЦВК БССР, члена бюро ЦК КП(б)Б А. Р. Чарвякова. Разам з З. Ф. Жылуновічам і іншымі дзеячамі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ён знаходзіўся ля вытокаў стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці, паўсядзённа ўплываў на ўздым яе эканомікі і культуры. У атмасферы перманентнага падаўлення іншадумства, арганічнай боязі ўсяго нацыянальнага, прэвентыўнага недапушчэння любой магчымай апазіцыі самастойная пазіцыя Чарвякова ў многіх пытаннях грамадскага развіцця не магла не раздражняць партыйных чыноўнікаў верхняга і асабліва сярэдняга звяна. Для іх сутыкненне з Аляксандрам Рыгоравічам было непазбежным. Патрэбен быў толькі зручны момант, каб нанесці ўдар.

ПЕРШЫ ЎДАР

На XII з'ездзе КП(б)Б (5—16 лютага 1929 г.) Чарвякоў асабліва вылучыў пытанні правядзення ў рэспубліцы нацыянальнай палітыкі. Ён напомніў дэлегатам рэзалюцыю аб правядзенні ў жыццё рашэнняў XII з'езда РКП(б) па нацыянальным пытанні. Пры гэтым асабліва падкрэсліў тую частку, якая датычылася мясцовай інтэлігенцыі ў нацыянальных рэспубліках і краях: «Камуніст на акраіне павінен памятаць: я — камуніст, таму я павінен, дзейнічаючы дастасавальна да данага асяроддзя, ісці на ўступкі тым мясцовым нацыянальным элементам, якія хочуць і могуць лаяльна працаваць у рамках савецкай сістэмы».

— Мне здаецца,— працягваў Чарвякоў,— калі мы ўспомнім гэтую пастанову, дык гэтым самым найлепш за ўсё зразумеем і тую лінію, якую стараецца праводзіць ЦК КП(б)Б у нацыянальным пытанні, як наогул, так і ў паасобных учынках, што мае тое ці іншае праяўленне на пэўных этапах развіцця, на пэўных этапах жыцця Савецкай Беларусі.

Першы нязгоду з пазіцыяй А. Р. Чарвякова выказаў сакратар Мінскага акружкома А. С. Славінскі.

Шырокі аналіз прамовы зрабіў другі сакратар ЦК КП(б)Б І. А. Васілевіч, які, дарэчы, заявіў: «Мы ні ў якім разе не можам прызнаць правільнай тэорыю ўступак інтэлігенцыі, каб на падставе яе скарыстоўваць інтэлігенцыю. Наадварот, мы гэтай тэорыі павінны абвясціць самую рашучую барацьбу».

Перад заканчэннем абмеркавання справаздачы ЦК Чарвякоў, па патрабаванні дэлегатаў, зноў выйшаў на трыбуну, каб «растлумачыць» свой пункт погляду:

— Маё выступленне выклікала бурную рэакцыю ў выглядзе зусім не зразумелых для мяне па тону, зместу і характары выступленняў маіх апанентаў. Таму я лічу неабходным зрабіць наступную заяву.

Каб абгрунтаваць некаторыя моманты лініі ЦК у нацпытанні, я спаслаўся на рэзалюцыю нарады 1923 г., якая называецца «Практические мероприятия по проведению в жизнь резолюции XII Съезда партии по национальному вопросу».

Зачытаўшы яе, я хацеў зрабіць пэўную ўстаноўку і толькі таму не зрабіў да гэтага ніякіх каментарыяў...

Я думаю, што з майго боку было неасцярожна, асабліва ў момант абвостранай барацьбы супраць правага ўхілу, які выявіўся ў КП(б)Б у якасці нацыяналістычных выступленняў асобных членаў нашай партыі, прачытаць без каментарыяў тое месца рэзалюцыі, дзе гаворыцца, што «партия должна идти на уступки тем национальным местным элементам, которые хотят и могут работать в рамках советской системы». Зразумела, што, імёны беручы пад увагу асаблівасці нашага перыяду, тое, што ў нас падраслі значныя кадры маладой пралетарскай інтэлігенцыі, што КП(б)Б вырасла, камсамол вырас і г. д.,— гэты пункт на даным перыядзе развіцця траціць сваю вастрыню, бо мы маем магчымасць ужо больш рашуча наступаць на тыя элементы нацыяналістычнай інтэлігенцыі, якія хацелі б захаваць сваё манапольнае становішча, каб падпарадкаваць свайму ўплыву і партыйны, і савецкі апарат і тым самым перашкаджаць узмацненню дыктатуры пралетарыяту.

Падводзячы вынікі абмеркавання, першы сакратар ЦК Я. Б. Гамарнік спыніўся і на прамове А. Р. Чарвякова. Абагульніўшы выказаныя па ёй меркаванні і пералічыўшы памылковыя, на яго погляд, выказванні, ён, тым не менш, палічыў інцыдэнт вычарпаным: «...прамова тав. Чарвякова выклікала палеміку і палеміку залішне вострую... Тав. Чарвякоў сваім другім выступленнем поўнасцю вычарпаў і ліквідаваў пытанне».

За абстрактнымі на першы погляд спрэчкамі аб рэзалюцыі 1923 года стаяла вострая праблема адносін да старой інтэлігенцыі і шляхоў далейшага развіцця беларускай нацыянальнай культуры. «Наступленне» на яе і баяўся Чарвякоў.

ПЯТЛЯ СЦІСКАЕЦЦА

Далейшае развіццё падзей паказала, што пазіцыя Чарвякова адлюстравала неразуменне ім (ды і не толькі ім) тых рэзкіх перамен — па сталінскай тэрміналогіі, «карэнны паваротъ», «вялікі пералом»,— якія пачаліся ў краіне і асабліва выразна праявіліся на рубяжы 20—30-х гадоў. У рашаючую фазу ўступаў здзяйснены Сталіным і яго акружэннем палітычны пераварот, з якога пачаўся той самы «посттермидорианский социализм», што і сёння не знаходзіць дакладнага вызначэння. Гэта быў сапраўды контрэвалюцыйны пераварот, які павярнуў краіну ад ідэалаў Кастрычніка.

На такім фоне мяняліся характар нацыянальнай палітыкі, якая раней праводзілася, і яе накіраванасць, непрымірымымі станавіліся адносіны да старой нацыянальнай інтэлігенцыі. Перад ёю паўставала дылема: альбо поўнасцю прыняць новы курс, альбо сысці з гістарычнай арэны. Калі яшчэ нядаўна, напрыклад, тэрмін «нацыянал-дэмакратызм» тлумачыўся як імкненне нацыянальныя інтарэсы ставіць вышэй класавых, нацыянальную форму культуры — вышэй пралетарскага зместу, то цяпер, па сцвярджэнні рэдакцыйнага артыкула газеты «Звязда» (лістапад 1929 г.), нацыянал-дэмакратызм ператварыўся ў «ідэалогію капіталістычных элементаў, якія аказваюць супраціўленне і пад сцягам буржуазнага нацыяналізму вядуць барацьбу супраць сацыялістычнага будаўніцтва».

Па сваім змесце артыкул быў блізкі да палажэнняў даклада члена прэзідыума ЦКК ВКП(б) У. П. Затонскага, пад кіраўніцтвам якога ў маі — чэрвені 1929 г. аналізавалася практыка нацработы ў БССР. На пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б аўтар даклада рэкамендаваў:

Нельга скочвацца ні ў тэорыі, ні ў практыцы да тэорыі перманентных уступак нацыяналістам, асабліва на той ступені развіцця, на якой зараз стаіць БССР. Памылкі і ўхілы трэба не прыкрываць, а выкрываць, каб на іх вучыцца.

(...) Неабходна рашуча спыніць залішне працяглую палітыку паддобрывання вярхамі інтэлігенцыі (у тым ліку і тую частку, якая мае партбілеты) і стаць на шлях смелага і рашучага вылучэння свежых маладых сіл, якія, несумненна, ёсць, але якіх не ўмеюць знаходзіць і баяцца вылучаць.

(...) Неабходна рашуча спыніць практыку дамашняга вырашэння рознагалосся па асноўных пытаннях і прымірэнчых адносін да магчымых ухілаў — ад бальшавізму.

У дакладзе Чарвякоў упамінаецца адзін раз — у сувязі з тым, што ён «всячески солидаризуется с Жилуновичем, идеализируя его прошлое», пры гэтым запэўнівае, што Жылуновіч у даны момант «идет твердо по дороге к будущему». Тым не менш было бачна, што і над ім, як і над тымі, каму прыклеілі ярлык нацыяналіста (Жылуновіч, Ігнатоўскі, Баліцкі, Прышчэпаў, шэраг прадстаўнікоў «верхушки» творчай і навуковай інтэлігенцыі, «играющей непомерно большую роль»), навісла пагроза. Для некаторых кіруючых работнікаў, часта далёкіх ад нацыянальных інтарэсаў свайго народа, але вельмі старанных па выкананні «загадаў зверху», патрэбна была «мішэнь», удар па якой спыніў бы нарастанне «небяспекі». Паступалі па прынцыпу: раз нацыяналізм ёсць на Украіне, у Татарыі, іншых рэспубліках, то павінен быць ён і ў Беларусі. Як адзначалася ў артыкуле «Звязды», «законы і логіка абвостранай класавай барацьбы агульныя і для Беларусі». Такой зручнай мішэнню з пазіцый сталінскага «рашаючага павароту ва ўсёй нашай палітыцы» і быў Чарвякоў.

Восенню 1929 г. на акружных і іншых партыйных сходах Чарвякова і прама, і намёкамі падвяргаюць крытыцы за адхіленне ад барацьбы з правай небяспекай, нацыянал-дэмакратызмам, за ўступкі носьбітам нацыяналістычных ідэй, намякаюць на яго ўласныя памылкі ў мінулым і цяпер. На сходзе актыву Фрунзенскай партарганізацыі г. Мінска, яўна маючы на ўвазе А. Р. Чарвякова, напрыклад, гаварылася: «Рад адказных камуністаў-беларусаў да сённяшняга дня не выказаў сваіх поглядаў на факты нацыянал-дэмакратызму, якія выявіліся ў нас у апошні час. Да гэтага часу аўтары «тэорыі» ўступак нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыі **не выступілі** перад партыйнымі масамі з прызнаннем сваіх памылак. Яны **не** сказалі — ці з'яўляюцца іх памылкі вынікам палітычнай блізарукасці, ці свядомай апартуністычнай «тэорыяй».

У снежні дзейнасць Чарвякова дэталёва разглядаюць на сумесным пасяджэнні бюро ЦК і прэзідыума ЦКК КП(б)Б. Кропкі над слухамі і вымысламі былі расстаўлены 27 снежня 1929 г. у рэдакцыйным артыкуле цэнтральнага органа Кампартыі Беларусі газеты «Звязда» пад назвай «У барацьбе за бальшавіцкую лінію партыі», напісаным па матэрыялах гэтага пасяджэння. У публікацыі падрабязна пераказваліся ўсе «грахі», якія інкрымінаваліся Чарвякову за час яго працы на кіруючых пасадах у рэспубліцы і якія склаліся ў «сістэму права- і нацыянал-апартуністычных поглядаў». Было адзначана таксама, што ланцуг такіх памылак дапаўняецца «праваапартуністычнай тэорыяй уступак інтэлігенцыі, агалошанай ім (Чарвяковым.—Аўт.) на XII з'ездзе КП(б)Б».

Некалькі раней у другім рэдакцыйным артыкуле «Аб правым ухіле ў КП(б)Б па нацыянальным пытанні» сцвярджалася, што верхавінны пласт старой інтэлігенцыі «інакш як агентура класавага ворага» разглядвацца не можа, што на яго «не могуць і не павінны пашырацца пастановы нашай партыі, якія адносяцца да перыяду пачатку сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва ў нацыянальных раёнах». Зразумела, гаварылася ў газеце, «чаму партыя рубам паставіла перад тав. Чарвяковым пытанне аб яго адносінах да генеральнай лініі партыі».

У гэтым жа нумары надрукаваны і артыкул самога А. Р. Чарвякова. У ім ён прызнаваў памылкі і абяцаў практычнай работай выправіць іх. «Артыкул, які друкуецца сёння,— пісала «Звязда»,— сведчыць, што тав. Чарвякоў стаў на шлях асуджэння сваіх памылковых поглядаў».

Што ж гэта за «памылковыя погляды»? Рэзалюцыя, зацверджаная студзеньскім (1930 г.) пленумам ЦК КП(б)Б пад назвай «Аб пазіцыі Чарвякова па пытаннях барацьбы з правым ухілам і нацыянал-дэмакратызмам», дае аб іх поўнае ўяўленне:

Бюро ЦК і Прэзідыум ЦКК КП(б)Б, абгаварыўшы пазіцыю тав. Чарвякова па пытаннях барацьбы з правым ухілам і нацыянал-дэмакратызмам, устанаўліваюць адсутнасць актыўнага ўдзелу т. Чарвякова ў барацьбе з правым ухілам і нацыянал-дэмакратызмам і што тав. Чарвякоў на працягу доўгага перыяду і да апошняга часу ў шэрагу выступленняў вусных і ў друку выказваў і абараняў шэраг няправільных, праваўхілісцкіх установак. Гэтыя праваўхілісцкія ўстаноўкі, узятыя ўагуле (у цэлым), аб'ектыўна ўяўляюць сабою цэлую сістэму праваапартуністычных і нацыянал-апартуністычных поглядаў.

Гэтыя праваапартуністычныя і нацыянал-апартуністычныя погляды і ўстаноўкі тав. Чарвякова знайшлі свой адбітак, у прыватнасці, у наступным:

— У адпаведнасці з лозунгам Бухарына «Обогащайтесь» тав. Чарвякоў на VII з'ездзе Саветаў БССР у маі 1925 г. выступіў з лозунгам: «Багацей, селянін, здабывай больш багацця, і чым больш ты будзеш багаты, тым больш багатаю будзе наша Савецкая рабоча-сялянская дзяржава».

— Услед за Бухарыным тав. Чарвякоў угледжваў крыніцы нашых хлебных цяжкасцей у першую чаргу ў тым, што «збожжавыя прадукты ў сэнсе цэн былі пастаўлены нашай палітыкай у недастаткова здавальняючыя ўмовы» (прамова 20 кастрычніка 1928 г. на з'ездзе «Прэч непісьменнасць»).

— Пасля апублікавання «Запісак эканаміста» т. Бухарына т. Чарвякоў такім чынам выяўляў сваю салідарнасць з праваапартуністычнымі поглядамі Бухарына: «Мы, таварышы, перажываем ужо досыць доўгі час значныя цяжкасці ў забяспечанні горада і вёскі хлебам і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі. Разам з тым мы перажываем сур'ёзныя цяжкасці ў забяспечанні горада і вёскі таварамі фабрычна-заводскай вытворчасці. Чым гэта тлумачыцца і дзе знайсці прычыны гэтых цяжкасцей? Нядаўна ў цэнтральных газетах быў надрукаваны артыкул т. Бухарына «Запіскі эканаміста», у якім ён робіць аналіз усіх пытанняў, звязаных з гэтай праблемай. Я, таварышы, адсылаю ўсіх вас да гэтага артыкула, які, па-мойму, патрэбна ўважліва вывучыць і на падставе якога патрэбна шукаць спосабы для растлумачэння ўсіх з'явішчаў нашага сучаснага гаспадарчага становішча».

— Тав. Чарвякоў змазваў кіруючую ролю ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве рабочага класа. Так, напрыклад, на з'ездзе аграномаў 26 студзеня 1929 г. тав. Чарвякоў, кажучы аб неабходнасці ўздыму сельскае гаспадаркі, бачыў нашую перавагу перад капіталістычнымі дзяржавамі ў галіне вырашэння гэтае задачы ў наступным: «Нам патрэбна, мы можам і павінны ісці ўперад па шляху развіцця сельскай гаспадаркі больш шпаркім крокам, больш паскоранымі тэмпамі, чым ішлі капіталістычныя дзяржавы. Для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае: першае — высокаразвітая навука, другое — высокаразвітая тэхніка і трэцяе — неабходнасць хутчэйшага вырашэння задач сацыялістычнага будаўніцтва». Аб дыктатуры пралетарыяту — грунтоўнай умове поспеху высокіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, аб рабочым класе і яе партыі — кіраўніку будаўніцтва — тав. Чарвякоў нічога не сказаў.

— Тав. Чарвякоў не разумее ўсёй механікі класавай барацьбы на вёсцы і яе няўхільнага абвастрэння ў сучасны перыяд сацыялістычнай рэканструкцыі...

— Тав. Чарвякоў замест таго, каб падкрэсліваць кіруючую ролю рабочага класа ў сацыялістычным будаўніцтве, класавае расслаенне сялянства (бядняк, серадняк, кулак), у сваіх прамовах усё гэта замяняў выразамі «насельніцтва», «народ». Ён лічыў магчымым у 1928 г. пісаць наступнае: «Цяжкі лёс выпаў на долю Беларусі. Разбурэнні вайной, цяжкая акупацыя немцаў і, урэшце, здрадніцкая палітыка Рады — усё гэта выключна паслабіла сілы народа».

— Тав. Чарвякоў ідэалізуе буржуазныя нацыянальныя дарэвалюцыйныя партыі Беларусі, прадстаўляе справу такім чынам, што КП(б)Б працягвае справу гэтых буржуазна-нацыяналістычных партый.

— У сваёй прамове, прысвечанай 5-й гадавіне ўтварэння БССР, тав. Чарвякоў няправільна трактуе пытанне аб Рыжскім міры і гэтым дае падставу лічыць, што вінаўнікам падзелу Беларусі з'яўляецца мірная палітыка Савецкага Саюза.

— Тав. Чарвякоў асуджае палітыку нашае партыі ў адносінах да контррэвалюцыйных беларускіх арганізацый (Беларускі нацыянальны кангрэс у 1917 г.). Ён кажа: «Абстаноўка работы кангрэса і асабліва спыненне гэтай работы выклікалі вялікае абурэнне нават сярод шчырых прыхільнікаў Саветаў («Полымя», 1928 г.).

— Тав. Чарвякоў падмяняе пралетарскі характар Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі дробнабуржуазным, калі гаворыць: «Агонь Кастрычнікавай рэвалюцыі надаў сілы пазту (гутарка ідзе пра Жылуновіча), *бо ён адчуваў сваю блізкасць да рабоча-сялянскай рэвалюцыі».*

«Рэвалюцыя (Кастрычніцкая) прыйшла ад цяжкасці сох». («Полымя», 1928 г.). Тав. Чарвякоў прыпісвае інтэлігенцыі няправільную ролю гегемона ў рэвалюцыйнай барацьбе і ў падрыхтоўцы рэвалюцыі: «Для нас асабліва каштоўныя ўсе тыя рэвалюцыйныя сілы (інтэлігенцыя), якія ў той час (у час царызму) працавалі, бо яны, развіваючы рэвалюцыйны рух сярод сялянства, афармлялі яго, стваралі ўсё большыя прыпынкі паміж царызмам і сялянствам і падрыхтоўвалі тую глебу, без якой заваёвы Камуністычнай партыі і сялянства не прайшлі б так лёгка, як яны прайшлі ў гады 17, 18, 19» (з прамовы тав. Чарвякова 31 снежня 1924 г.). І нарэшце ў артыкуле пра Цішку Гартнага («Полымя», 1928 г.) тав. Чарвякоў піша: «З першых жа дзён Кастрычніка ён стаў на шлях Кастрычніцкай рэвалюцыі, разбіўшы аўтарытэтам старога «нашаніўца-адраджэнца» адзіны нацыянальны супрацьсавецкі беларускі фронт».

— Гэтую серыю праваапартуністычных і нацыянал-апартуністычных поглядаў і ўстановак тав. Чарвякоў папоўніў выступленнем на XII з'ездзе партыі з тэорыяй уступак інтэлігенцыі.

Крытыка «пазіцыі» Чарвякова прадаўжалася на XIII з'ездзе КП(б)Б (30 мая — 12 чэрвеня 1930 г.). Першы сакратар ЦК К. В. Гей, удзельнікі спрэчак паўтаралі ў асноўным тое, што было ўжо вядома з рэзалюцыі студзеньскага пленума. Шэраг сваіх «памылак» пашырыў сам Чарвякоў:

На XII з'ездзе КП(б)Б у той час, калі ўвага КП(б)Б была сканцэнтравана на тым, каб даць генеральны бой нацыянал-дэмакратычным тэндэнцыям, імкненням, праявам, калі КП(б)Б выкрывала шкоднасць устаноўкі Жылуновіча, калі КП(б)Б выкрывала шкоднасць вядомых выступленняў пісьменнікаў, тэатральную дыскусію і г. д.,— я зрабіў велічэзную палітычную памылку, якая была ў тым, што я замест таго, каб разам з КП(б)Б абрушыцца на гэтыя праявы нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму, фактычна ўзяў пад сваю абарону Жылуновіча, а разам з ім усе тыя тэндэнцыі, настроі і ўстаноўкі, што ім абараняліся, калі я працытаваў вядомую ўсім нам рэзалюцыю «нацыянальнай нарады» 1923 г.

Прывядзём частку прамовы сакратара Мінскага акруговага камітэта партыі Славінскага, якога, як і некаторых іншых дэлегатаў

з'езда, выступленне Чарвякова не задаволіла:

— Я павінен з трыбуны з'езда проста заявіць, што т. Чарвякоў, нягледзячы на тое, што доўгі час знаходзіцца ў нашай партыі і ў яе кіруючых органах, але ён лепш разбіраецца ў пытаннях Беларускай сацыялістычнай грамады і «Нашай нівы», чым у пытаннях ленінізму. Мы павінны патрабаваць, каб т. Чарвякоў у канкрэтнай рабоце часцей заглядваў у творы Леніна, і тады толькі на практычнай рабоце ён свае памылкі зжыве. Мы павінны ў далейшым пільна сачыць, бо адно выступленне, адна заява недастаткова страхуе партыю ад рэцыдываў. Партыя павінна яшчэ доўга выхоўваць т. Чарвякова...

БЫВАЙ, ЖЫЦЦЁ!

У пачатку 30-х гадоў органы дзяржаўнай бяспекі «выкрылі», як было афіцыйна заяўлена, добра замаскіраваную контррэвалюцыйную арганізацыю «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ), якая нібыта дзейнічала ў рэспубліцы і ставіла мэтай звяржэнне Савецкай улады і ўстанаўленне буржуазнага ладу. Следчыя органы імкнуліся даказаць наяўнасць «сувязі» СВБ з іншымі контррэвалюцыйнымі арганізацыямі на тэрыторыі СССР, у першую чаргу з «Саюзам вызвалення Украіны», Ленінградскай «манархічнай арганізацыяй», Працоўнай сялянскай партыяй М. Д. Кандрацьева. Хаця ні тады, ні пазней ніякіх доказаў «існавання» гэтай арганізацыі не знайшлі, тым не менш «па справе «СВБ» было асуджана 90 прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі і дзяржаўных дзеячаў, у тым ліку вучоныя Я. Ю. Лёсік, С. М. Некрашэвіч, В. Ю. Ластоўскі, А. І. Цвікевіч, А. А. Смоліч, І. І. Серада, наркомы Д. Ф. Прышчэпаў, А. Ф. Адамовіч, А. В. Баліцкі і інш. У нацыянал-ухілізме быў абвінавачаны відны грамадскі дзеяч, гісторык, прэзідэнт Беларускай акадэміі навук У. М. Ігнатоўскі, які пасля неаднаразовых выклікаў на допыты скончыў жыццё самагубствам. Потым надышла чарга сакратара ЦК КП(б)Б І. А. Васілевіча, рэдактара «Чырвонай змены» П. Р. Галавача.

У лістападзе 1936 г. быў арыштаваны народны паэт Беларусі З. Ф. Жылуновіч (Цішка Гартны), жыццё якога трагічна абарвалася ў няволі. У чэрвені 1937 г. арыштавалі старшыню Саўнаркома М. М. Галадзеда. Лёс яго таксама аказаўся трагічным — ён загінуў у турме пры нявысветленых да гэтага часу абставінах.

Абстаноўка ў рэспубліцы, асабліва пасля лютаўска-сакавіцкага пленума ЦК ВКП(б) і прамовы на ім Сталіна, якія адкрылі поўную прастору для палітычнага тэрору, станавілася надзвычай цяжкай. Паўсюдна пачаліся пошукі і выкрыццё шкоднікаў, шпіёнаў, дыверсантаў, нарасталі ўсеагульная падазронасць і недавер. Хаця парадак дня XVI з'езда арыентаваў на звычайнае абмеркаванне справаздачы ЦК і рэўкамісіі, аднак менавіта рашэнні лютаўска-сакавіцкага пленума вызначылі ўвесь ход з'езда, надалі яму напал істэрычнасці, крыклівасці і выкрывальніцтва.

Першы сакратар ЦК КП(б)Б В. Ф. Шаранговіч пабудаваў свой даклад на выкрыцці «ў духу сталінскіх указанняў» недахопаў партыйна-палітычнай работы, шкодніцтва ў прамысловасці і ў наркаматах. Былі пералічаны дзесяткі прадпрыемстваў, дзе на розных пасадах, ад майстра да дырэктара, нібыта дзейнічалі шкоднікі. Але асабліва шмат іх, згодна дакладчыку, аказалася на ўчастках культурна-нацыянальнага будаўніцтва і ідэалагічнага фронту. Шукаў В. Ф. Шаранговіч і вінаватых.

«...У святле ўскрытых фактаў контррэвалюцыйнай, здрадніцкай ролі БКА, нацдэмаў, правых, якую яны адыгрывалі ў Беларусі, у святле апошніх іх спраў,— звяртаўся ён да дэлегатаў,— нядрэнна будзе, калі тав. Чарвякоў, які з усімі імі ў свой час салідарызаваўся і падтрымліваў (хоць ён ужо і крытыкаваў сябе за гэтыя свае памылкі), раскажа нам, як ён глядзіць на ўсё гэта цяпер».

Пасля такога «запеву» дзелавое абмеркаванне парадку дня было падменена агульнымі разважаннямі аб «падкопах» і «выкрыцці» «ворагаў народа». На Чарвякова нападалі асабліва жорстка. У прэзідыум паступалі запіскі з выказваннем яму палітычнага недаверу. Адчувалася, што нехта кіраваў гэтым спектаклем. Выступленне Чарвякова не задаволіла дэлегатаў, было сустрэта імі даволі варожа.

Пасля выступлення нападкі на старшыню ЦВК рэспублікі ўзмацніліся. Яго абвінавачвалі ў тым, што за час праверкі партыйных дакументаў ён не выкрыў ніводнага ворага. Патрабавалі назваць варожыя карані тых шкоднікаў, што яшчэ застаюцца ў партыі. Поўная намёкаў была прамова загадчыка сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б Вайновіча:

— У Беларусі больш чым дзе б там ні было дзейнічалі трацкісцка-правыя і нацыяналістычныя найміты фашызму.

Гэтыя ворагі народа нямала нашкодзілі нам. Тут у недалёкім мінулым на чале наркамзема стаяў вядомы здраднік інтарэсаў беларускага народа нацдэм Прышчэпаў, які за 6 гадоў сваёй «работы» здолеў перавесці больш як 100 тыс. сялянскіх гаспадарак на хутары і стварыць тысячы кулацкіх гнёздаў. Яго змяніў бліжэйшы сябар і прадаўжальнік контррэвалюцыйнай справы Масюкоў. Тут былі і «працавалі» доўгі час на культурным фронце прадажныя сабакі польскага фашызму — Ігнатоўскі, Баліцкі, Адамовіч і іншыя. Тут быў белапольскі пасланец шпіён Домбаль са сваёй світай шпіёнаў, забойцаў, тэрарыстаў. Тут

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

Расціслаў ПЛАТОНАЎ,
вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага цэнтра дакументазнаўства і рэтраінфармацыі.